ISSN 3072-3140, eISSN 3072-4376
Copyright © by Inna Kalita, Nina Skepyan 2025
Creative Commons Attribution-NonComercial 4.0
(CC BY-NC 4.0)
https://creativecommons.org/licenses/by-nc/4.0/
DOI: https://doi.org/10.31338/uw.ijbg.2025.6

Іна Каліта ♦ Inna Kalita

Беларускі інстытут у Празе, Чэхія
Belarusian Institute in Prague, Czech Republic
ORCID: https://orcid.org/0000-0003-0005-1425
e-mail: inna.kalita@belarus-institute.cz

Ніна Скеп'ян ♦ Nina Skepyan

Беларускі інстытут у Празе, Чэхія
Belarusian Institute in Prague, Czech Republic
ORCID: https://orcid.org/0000-0003-1536-3931
e-mail: nina.skepyan@belarus-institute.cz

Дзейнасць Беларускага інстытута ў Празе ў 2025 годзе

Activities of the Belarusian Institute in Prague in 2025

Abstract: The article reviews the activities of the Belarusian Institute in Prague in 2025. The Institute's work focused on research, publishing projects, the development of international cooperation, and the promotion of Belarusian scholarship in the humanities. The article also includes brief profiles of historians and philologists affiliated with the Institute.

Keywords: Belarusian Institute in Prague, scholarship, academic initiatives, publishing projects, international cooperation, scholar profiles.

Рэзюмэ: У артыкуле прадстаўлена дзейнасць Беларускага інстытута ў Празе ў 2025 г. Праца інстытута была засяроджана на даследчай дзейнасці, выдавецкіх праектах, развіцці міжнароднага супрацоўніцтва і папулярызацыі беларускай гуманітарыстыкі. Прадстаўлены кароткія візітоўкі гісторыкаў і філолагаў, якія ўваходзяць у Беларускі інстытут у Празе.

Ключавыя словы: Беларускі інстытут у Празе, навука, акадэмічныя ініцыятывы, выдавецкія праекты, міжнароднае супрацоўніцтва, візітоўкі вучоных.

У 2025 г. Беларускі інстытут у Празе [гл. Каліта, Скеп'ян 2024] аб'ядноўваў 8 навукоўцаў – гісторыкаў і лінгвістаў, і яго дзейнасць атрымала выразнае развіццё ў галіне даследчых і выдавецкіх праектаў. Гэта дазваляе гаварыць пра пераход ад этапу фарміравання да этапу кансалідацыі навуковых вынікаў. Побач з працягам лекцыйнай і семінарскай працы істотнае значэнне мелі падрыхтоўка і выданне калектыўных прац, а таксама арганізацыя і ўдзел у міжнародных акадэмічных ініцыятывах.

Адным з найбольш значных вынікаў стала выданне калектыўнай манаграфіі *Institute v exilu: Sto let od příchodu exilové vlády Běloruské lidové republiky do Prahy* [гл. Skepyan (рэд.) 2025], якая абагульняе даследаванні, прысвечаныя гісторыі беларускай палітычнай эміграцыі і функцыянаванню інстытуцый у выгнанні. Выданне лагічна працягвае ранейшыя праекты БІП, звязаныя з тэмай Рады БНР у Празе, і замацоўвае прысутнасць беларускай праблематыкі ў чэшскай акадэмічнай прасторы.

Паралельна ішла праца над перакладам лацінскіх гістарычных крыніц Таварыства Езуса, створаных на беларускіх землях, і падрыхтоўкай археаграфічнага выдання *Fontes Historiae Collegii Polocensis Societatis Iesu 1579–1611 = Крыніцы па гісторыі Полацкага калегіума Таварыства Езуса 1579–1611* [гл. Skepyan і інш. 2025]. Падрыхтаваны фундаментальны том уключае навукова-даследчы апарат, крытычны аналіз лацінскіх тэкстаў і іх беларускі пераклад, уводзіць у навуковы ўжытак комплекс крыніц, якія адлюстроўваюць пачатковы этап дзейнасці Таварыства Езуса на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага. У межах гэтага даследчага напрамку развівалася супрацоўніцтва БІП з Варшаўскім універсітэтам (факультэт *Artes Liberales*). Вынікам стала міжнародная навуковая канферэнцыя *Źródła i konteksty: Nowe perspektywy badań nad historią religii i Kościoła na ziemiach Rzeczypospolitej* (Варшава, 15–16.05.2025), матэрыялы якой выйшлі ў асобным выпуску "Rocznika Lituanistycznego". Акрамя таго, інстытут выступіў арганізатарам адной з панэляў *Міжнароднага кангрэса даследчыкаў Беларусі* (Берлін), а яго супрацоўнікі бралі ўдзел у шэрагу канферэнцый і семінараў, прадстаўляючы вынікі сваіх прац і ўключаючы беларускую тэматыку ў шырэйшы еўрапейскі кантэкст.

Разам з тым працягвалася сістэмная праца ў рамках *Міжнароднага анлайн-семінара па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага*, які з мая 2025 г. рэалізуецца сумесна з інстытутам гісторыі Польскай акадэміі навук. За 2025 г. у межах семінара было праведзена 15 пасяджэнняў, што забяспечыла рэгулярную акадэмічную камунікацыю і стала важнай дыскусійнай пляцоўкай.

Такім чынам, у 2025 г. дзейнасць Беларускага інстытута ў Празе характарызавалася спалучэннем выдавецкай ініцыятывы, развіцця міжнароднага супрацоўніцтва і падтрымання ўстойлівых форм акадэмічнай камунікацыі, што ў цэлым адпавядае ягонай задачы як незалежнага цэнтра беларускай гуманітарнай навукі.

Персаналіі Беларускага інстытута ў Празе

к. гіст. н. Ніна Скеп'ян ♦ Nina Skepyan, PhD
(старшыня БІП)
https://orcid.org/0000-0003-1536-3931
Ніна Скеп'ян – беларускі гісторык. Нарадзілася ў Мінску, скончыла гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 2008 г. скончыла аспірантуру ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па спецыяльнасці *айчынная гісторыя*. У 2012–2013 гг. была запрошаным прафесарам у Інстытуце ўсходнеславянскіх даследаванняў Карлавага ўніверсітэта ў Празе. Сузаснавальніца і старшыня Беларускага інстытута ў Празе. Асноўныя навуковыя тэмы: палітычная гісторыя ВКЛ XV–XVI стст., рэпрэзентацыя і ўзаемадзеянне эліт, гісторыя езуітаў на беларускіх землях і лічбавая гуманітарыстыка. Аўтарка больш як 30 навуковых прац, укладальніца калектыўнай манаграфіі Skepyan N. (red.). 2025. *Institute v exilu*: *Sto let od příchodu exilové vlády Běloruské lidové republiky do Prahy*. Praha: Běloruský

Дзейнасць Беларускага інстытута ў Празе ў 2025 годзе

institut v Praze, Národní knihovna České republiky, Slovanská knihovna.

Важнейшыя публікацыі за апошнія 5 гадоў: Скеп'ян А., Скеп'ян Н. , Паўлоўская Г., Каліта І., Адамовіч А., Мінкевіч Д. 2025. *Fontes Historiae Collegii Polocensis Societatis Iesu 1579–1611 = Крыніцы па Гісторыі Полацкага Калегіума Таварыства Езуса 1579–1611*. Warszawa: Wydawnictwo Campidoglio; Skepyan N. 2022. *Losy emigrantów moskiewskich w Wielkim Księstwie Litewskim na przykładzie rodzin Kołyczewów i Neledińskich*. "Rocznik Lituanistyczny" 8: 27–47; Скеп'ян Н. 2022. *Стаўленне да ўніі з Каронай Польскай канцлераў Вялікага княства Літоўскага ў сярэдзіне XV – першай палове XVI стст*. У: Н. Скеп'ян (рэд.). *Актуальные проблемы истории и культуры. Вялікае княства Літоўскае: заканадаўчае забеспячэнне дзяржаўнага суверэнітэту*. Вып. 3. Мінск: Беларуская навука. 115–130; Скеп'ян Н. 2022. *Роля канцлера ў прыняцці Статутаў ВКЛ у XVI ст.* У: Н. Скеп'ян (рэд.). *Актуальные проблемы истории и культуры. Вялікае княства Літоўскае: заканадаўчае забеспячэнне дзяржаўнага суверэнітэту*. Вып. 3. Мінск: Беларуская навука. 311–325.

доктар хаб. Міраслаў Янковяк ♦ Mirosław Jankowiak, Dr hab. (намеснік старшыні)
https://orcid.org/0000-0001-6212-1463

Міраслаў Янковяк – польскі і чэшскі лінгвіст. Нарадзіўся ў Варшаве. Скончыў Варшаўскі ўніверсітэт (спецыяльнасці *польская філалогія; беларуская філалогія; Усходняя Еўропа, культуралогія*) і дактарантуру ў Інстытуце славістыкі Польскай акадэміі навук па спецыяльнасці *лінгвістыка*. Ступень доктар хабілітаваны атрымаў у 2023 г. у Торуньскім універсітэце. З'яўляецца навуковым супрацоўнікам аддзялення славянскага мовазнаўства Акадэміі навук Чэшскай Рэспублікі і кафедры беларусістыкі Варшаўскага ўніверсітэта. Асноўныя навуковыя тэмы: дыялекталогія, даследаванне балта-славянскага моўнага памежжа. Аўтар 7 манаграфій, больш як 100 навуковых артыкулаў, суаўтар слоўніка (*Słownik Mówionej Polszczyzny Północnokresowej*), сурэдактар 4 калектыўных манаграфій, галоўны рэдактар рэцэнзаванага штогодніка "Латышы і беларусы: разам праз стагоддзі".

Важнейшыя публікацыі за апошнія 5 гадоў: Jankowiak M. 2025. *Współczesne gwary białoruskie na Litwie. Tom drugi: Rejon solecznicki = Šiuolaikinės baltarusių šnektos Lietuvoje. Antrasis tomas: Šalčininkų rajonas*. Vilnius: Lietuvių kalbos institutas; Jankowiak M. 2025. *Běloruská nářečí v Lotyšsku jako příklad lexikálního dědictví baltoslovanského pomezí = Gwary białoruskie na Łotwie jako przykład leksykalnego dziedzictwa pogranicza bałtycko-słowiańskiego*. Praha: Slovanský ústav AV ČR, v. v. i.; Jankowiak M., Vašíček M. (eds.). 2025. *Slovanské dialekty v době digitálních technologií. Nářeční prameny a jejich současné zpracování*. Praha: Slovanský ústav AV ČR, v. v. i.; Jankowiak M. 2025. *Sociolinguistic Situation and Language Policies in Belarus*. In: A. Kazharski (ed.). *Routledge Handbook of Contemporary Belarus*. Lonodn – Ney York: Routledge. 182–189; Jankowiak M. 2024. *Polish Spoken Language and Belarusian Dialects in Lithuania: Preliminary Considerations on Selected Areal Aspects*. "Theoria et Historia Scientiarum" 21: 143–162.

д-р філасофіі, к. філал. навук Іна Каліта ♦ Inna Kalita, PhDr, PhD
https://orcid.org/0000-0003-0005-1425

Іна Каліта – беларуская і чэшская лінгвістка, літаратуразнаўца і педагог. Нарадзілася ў Берасці. Скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці *філалогія: беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура*; дактарантуру ў Інстытуце ўсходнеславянскіх даследаванняў Карлавага ўніверсітэта ў Празе па спецыяльнасці *славянскія філалогіі* (2010). Выкладала беларускую мову ў сярэдніх школах г. Берасця і Кобрына, рускую мову ва Універсітэце імя Яна Евангелісты Пуркіне ў Усці над Лабэм (Чэхія) (2001–2023). Аўтарка 7 манаграфій, універсітэцкіх падручнікаў і дапаможнікаў па рускай мове, звыш 150 навуковых публікацый. Сфера навуковых інтарэсаў: беларусістыка і русісітыка,

перакладазнаўства, кампаратыўнае вывучэнне славянскіх моў, сацыялінгвістыка, фразеалогія, моўная экалогія і методыка выкладання моў як родных, як другіх і як замежных.

Важнейшыя публікацыі за апошнія 5 гадоў: Каліта І. 2025. *Абразок у святле традыцыі пераемнасці: ад Змітрака Бядулі да Юркі Максімчыка*. "Studia Białorutenistyczne" 19: 117–135; Скеп'ян А., Скеп'ян Н., Паўлоўская Г., Каліта І., Адамовіч А., Мінкевіч Д. 2025. *Fontes Historiae Collegii Polocensis Societatis Iesu 1579–1611 = Крыніцы па гісторыі Полацкага Калегіума Таварыства Езуса 1579–1611*. Warszawa: Wydawnictwo Campidoglio; Каліта І. 2025. *Фразеалагізмы і парэміі ў кнізе Аляксея Дзікавіцкага "Оньдэ"*. "Slavia Orientalis" LXXIV (1): 171–185; Каліта І. 2025. *Прэфіксы са значэннем 'сумеснасць' у беларускай і чэшскай мовах*. У: І. Л. Капылоў, І. У. Ялынцава (рэд.). *Беларуская мова – галоўная гісторыка-культурная каштоўнасць нацыі і дзяржавы (да 95-годдзя Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа)*. Мінск: Беларуская навука. 63–70; Каліта І. 2024. *Патэнцыял народнай песні з перспектывы параўнальнай глотадыдактыкі*. "International Journal of Belarusian Glottodidactics" 8: 24–40.

к. гіст. н. Мікола Волкаў ♦ Mikola Volkau, PhD
https://orcid.org/0000-0003-1840-4145

Мікола Волкаў – беларускі гісторык. Нарадзіўся ў Мінску. Скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, магістратуру Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта па спецыяльнасці *ахова і інтэрпрэтацыя гісторыка-культурнай спадчыны*, магістратуру Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН Беларусі па спецыяльнасці *мастацтвазнаўства*, аспірантуру ў Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па спецыяльнасці *айчынная гісторыя*. Працаваў у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі, Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі і ЕГУ (Літва). З 2025 г. – навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Польскай акадэміі навук. Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя фартыфікацыі, артылерыі, ваеннай справы, архітэктуры, горадабудаўніцтва, урбанізацыі і лагістыкі ВКЛ у ранні Новы час (XVI–XVIII стст.). Аўтар 3 манаграфій і 2 у суаўтарстве, больш як 70 навуковых артыкулаў.

Важнейшыя публікацыі за апошнія 5 гадоў: Volkau M. 2025. *The Cult of St. Nicholas as the Patron of Merchants in the Grand Duchy of Lithuania*. "Journal of Belarusian Studies" 13 (2023), is. 2: 151–177; Волкаў М., Макараў М. 2024. *Віцебскія замкі ў XIV – першай палове XVII ст.: архітэктура і соцыум*. "Rocznik Lituanistyczny" 10: 7–47; Volkau M. 2023. *Stary Zamek w Grodnie od końca XVI w. do początków XVIII w. Architektura oraz układ funkcjonalny*. "Artifex Novus" 7: 78–104; Volkau M. 2023. *Zamki i drogi na białoruskim Podźwiniu w czasie wojny inflanckiej (1558–1583)*. "Zapiski Historyczne", t. 88, z. 3: 27–57; Volkau M. 2022. *Arsenały fortec Wielkiego Księstwa Litewskiego na przełomie XVII i XVIII wieku*. У: M. Trąbski (red.). *Twierdze osiemnastowiecznej Europy*. T. 4. Częstochowa: Wydawnictwo Naukowe Uniwersytetu Humanistyczno-Przyrodniczego im. Jana Długosza w Częstochowie przy współudziale Polskiego Towarzystwa Historycznego. Oddział w Częstochowie. 313–326.

магістр Максім Каралёў ♦ Maxim Karaliou, mgr
https://orcid.org/0000-0001-5365-8365

Максім Каралёў – беларускі педагог і гісторык. Вывучаў *тэалогію* ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава (ступень магістра агульнай педагогікі і гісторыі педагогікі і адукацыі). Выкладаў у Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце (2007–2020 гг.). Займаецца ў Доктарскай школе *Антрапас* пры Інстытуце гісторыі імя Тадэвуша Мантойфеля Польскай акадэміі навук. Заснавальнік і адказны рэдактар рэцэнзаванага штогодніка "Латышы і беларусы: разам праз стагоддзі". Сфера навуковых інтарэсаў: нацыянальная палітыка ва Усходняй Еўропе з сярэдзіны XIX ст. да сучаснасці; становішча латышоў і палякаў на беларускіх землях і беларусаў у Латвіі ў міжваенны перыяд; трансфармацыя беларускага грамадства пасля падзей 2020 г. Аўтар вучэбна-метадычных дапаможнікаў,

Дзейнасць Беларускага інстытута ў Празе ў 2025 годзе

суаўтар 5 калектыўных манаграфій і шэрагу навуковых артыкулаў.

Важнейшыя публікацыі за апошнія 5 гадоў: Каралёў М. 2025. *Савецкая Беларусь 1922–1925: польскі позірк з Рыгі*. "Латыши и белорусы: вместе сквозь века" 14: 56–72; Karaliou M. 2024. *Obraz ludności polskiej w Białorusi Sowieckiej w oczach komunistów Polaków z połowy lat dwudziestych XX wieku*. "Studia z dziejów Rosji i Europy Środkowo-Wschodniej" LIX, z. 1: 89–114; Каралёў М. 2024. *"Не будзьце мудрымі самі з сабой": Ці магчымая дэкаланізацыя акадэмічных гуманітарных даследаванняў у Беларусі? (погляд гісторыка)*. "Topos" 2: 93–104; Karaliou M. 2023. *Nowa próba opowieści o polskiej Dzierżyńszczyźnie. Na marginesie pracy Anatola Wialikiego (Anatol Wialiki, Dzierżyńszczyzna 1932–1937. Rejon skazany na likwidację, red. nauk. J. Szumski, tłum. J. Kurkowski, Warszawa 2021, Instytut Pamięci Narodowej, ss. 224*). "Dzieje Najnowsze" 1: 217–230; Каралёў М., Крэнт Дз. 2022. *Даручыць таварышу Шкільтэру: Латышскія даследаванні ў міжваеннай БССР*. Віцебск – Warszawa: ЛиБ.

магістр Павел Котаў ♦ Pavel Kotau, mgr
ORCID: 0000-0003-4615-3371

Павел Котаў – беларускі і чэшскі гісторык. Нарадзіўся ў Мінску. Вывучаў *гісторыю* на філасофскім факультэце Карлавага ўніверсітэта ў Празе. Дактарант кафедры гісторыі філасофскага факультэта Універсітэта Палацкага ў Оламоўцы. Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя асветы, гісторыя рэлігій позняга Сярэднявечча і ранняга Новага часу, беларуская эміграцыя ў міжваеннай Чэхаславакіі. Даследуе жыццёвы шлях Ф. Скарыны. З'яўляецца суаўтарам тэкстаў выставы (разам з С. Кнырэвічам) *Імем беларускага народа… да 100-годдзя пераезду ў Прагу эміграцыйнага ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі* (*Jménem běloruského národa… 100 let od příchodu exilové vlády Běloruské lidové republiky do Prahy*) (6.10 – 29.12.2023, Прага, Славянская бібліятэка – Нацыянальная бібліятэка Чэшскай Рэспублікі).

Важнейшыя публікацыі за апошнія 5 гадоў: Котаў П. 2025. *Bílá Rus, Bělorus, Bělorusko – чэшскія назвы Беларусі ў 1833–1938 гадах*. У: N. Skepyan (red.). *Instituce v exilu. Sto let od příchodu exilové vlády Běloruské lidové republiky do Prahy*. Praha: Běloruský institut v Praze, Národní knihovna České republiky, Slovanská knihovna. 19–34; Котаў П. 2024. *Метадалогія і дэмагогія або яшчэ раз пра год нараджэння Францішка Скарыны*. "Przegląd Środkowo-Wschodni" 9: 249–262; Котаў П. 2022. *Новое прочтение или дорисовка?*. "Rocznik Lituanistyczny" 8: 273–277; Котаў П. 2021. *Праваслаўныя Вялікага Княства Літоўскага ў дыпламатычнай рыторыцы ў канцы XIV – пачатку XVI стст*. "Przegląd Środkowo-Wschodni" 6: 9-30.

магістр Віталь Ашэйчык ♦ Vitali Asheichyk, mgr
https://orcid.org/0000-0001-5083-620X

Віталь Ашэйчык – беларускі археолаг. Нарадзіўся ў Мінску. Закончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці *археалогія*. Падчас навучання ў БДУ, а пазей як навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі, удзельнічаў у некалькіх археалагічных экспедыцыях. Звесткі, атрыманыя пры працы з археалагічным матэрыялам, публікаваліся ў аўтарскіх і калектыўных артыкулах. Сфера навуковых інтарэсаў: помнікі каменнага і бронзавага вякоў на тэрыторыі Беларусі і даследаванне тэхналагічных аспектаў адаптацыі старажытнага насельніцтва. В. Ашэйчык – сябра Еўрапейскай асацыяцыі археолагаў (European Association of Archaeologists).

Важнейшыя публікацыі за апошнія 5 гадоў: Asheichyk V. et al. 2023. "The transmission of pottery technology among prehistoric European hunter-gatherers." *Nature Human Behaviour* 7: 171–183; Chen S., Vahur S., Teearu A., Juus T., Zhilin M., Savchenko S., Oshibkina S., Asheichyk V. et al. 2022. "Classification of archaeological adhesives from Eastern Europe and Urals by ATR-FT-IR spectroscopy and chemometric analysis." *Archaeometry* 64 (1): 227–244; Asheichyk V. et al. 2021. "Using Radiocarbon Dates and Tool Design Principles to Assessthe Role of Composite Slotted Bone Tool Technology at the Intersection of Adaptation and Culture-History." *Journal of Archaeological Method and Theory* 28: 845–870.

магістр Аляксандр Паршанкоў ♦ Aliaksandr Parshankou, mgr
Аляксандр Паршанкоў – гісторык, філолаг. Нарадзіўся ў Гомелі. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці *гісторыя*. Дактарант філасофскага факультэта Карлава ўніверсітэта ў Празе па спецыяльнасці *славянскія філалогіі*. Адзін з заснавальнікаў таварыства *Беларускае студэнцтва Чэхіі* (*Bělaruské studentstvo ČR*). З 2022 г. – сябра *Каардынацыйнай рады Беларусі*. Сфера навуковых інтарэсаў: кірылічнае кнігадрукаванне (да XVIII ст.), гісторыя культуры ВКЛ і лёс беларускага кнігадрукара Ф. Скарыны, рэфармаванне сістэмы адукацыі ў Беларусі.

Важнейшыя публікацыі за апошнія 5 гадоў:
Паршанкоў А. 2025. *Новыя фрагменты Біблії Францыска Скарыны*. "Slavistica Vilnensis" 70 (2): 161–164; Морозова Н., Паршенков А. 2024. *Франциск Скорина, Вроцлав и Адам Дион: книжная миграция и первый палеотип Великого княжества Литовского*. "Slavistica Vilnensis" 69 (2): 21–40; Parshankou A. 2023. "Year of Francysk Skaryna in Lithuania, Poland and the Czech Republic." *Slavistica Vilnensis* 68(1): 129–138; Паршенков А. 2022. *Издания эпохи Петра в Славянской библиотеке Праги*. В: Д. Н. Рамазанова (ред.). *Прекрасная была сия самая первая печать: кругла, мерна, чиста. Книжная культура эпохи Петра I*. Москва: Пашков дом. 128–141; Паршанкоў А. 2021. *Тайнапіс у самапрэзентацыі кнігапісцаў XVI ст.* У: В. Г. Сафонов (ред.). *77-я научная конференция студентов и аспирантов Белорусского государственного университета (11–22 мая 2020 г.). Материалы конф. в 3 ч.* Ч. 3. Минск: БГУ. 342–344.

References

Каліта Іна, Скеп'ян Ніна. 2024. *Беларускі інстытут у Празе*. "International Journal of Belarusian Glottodidactics" 4: 75–77 [Kalita Ina, Skep'jan Nina. 2024. *Belaruski instytut u Praze*. "International Journal of Belarusian Glottodidactics" 4: 75–77].

Skepyan Nina (red.). 2025. *Instituce v exilu. Sto let od příchodu exilové vlády Běloruské lidové republiky do Prahy*. Praha.

Skepyan Anastasiya, Skepyan Nina, Paulouskaya Hanna, Kalita Inna, Adamovitch Aliaksei, Minkevich Dmitry. 2025. *Fontes Historiae Collegii Polocensis Societatis Iesu 1579–1611 = Крыніцы па гісторыі Полацкага калегіума Таварыства Езуса 1579–1611*. Warszawa.